# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА Б. С. ШАРЭНДЫ

**Перыяд дзеяння:**

красавік 1942 г. – кастрычнік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

мастацкая майстэрня па вул. Леніна, г. Віцебск

**Колькасць:**

19 чалавек

**Кіраўнікі:**

Шарэнда Б. С. («Шура»)

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да кастрычніка 1943 г. Аб’ядноўвала 19 чалавек. Кіраўнік Б. С. Шарэнда («Шура»). У групу ўваходзілі: яго бацька, Савелій Спірыдонавіч, маці Хрысціна Іванаўна, жонка А. А. Шарэнда, мастакі Я. П. Барадулін, браты В. Ц. і І. Ц. Раманавы, Я. С. Трафімаў, чыгуначнікі І. Ц. Пушкароў і М. К. Быкоўскі, жонка М. Быкощскага – медработнік Г. Г. Аляксеенка, загадчык склада панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя КІМ А. І. Мастыка, яго жонка Н. Ц. Мастыка і інш.

Група сфарміравана па ініцыятыве разведчыка М. А. Шпакава з армейскай разведгрупы Ю. С. Рудакова («Жорж», «Ягор»). Вясной 1942 г. мастакі ўзялі патэнт на адкрыццё прыватнай мастацкай майстэрні (па вул. Леніна), дзе гітлераўскія афіцэры ахвотна рабілі заказы, а гарадская ўправа выпісала мастакам пропуск на права перамяшчэння па горадзе. Падпольшчыкі сустракаліся ў майстэрні і адтуль свчылі за рухам вырожых войск, сувязных прымал на кватэры Шарэнды (вул. 3-я Загарадная, 20).

Па заказах, якія дастаўляліся на дом, мастакі вызначалі род войскаў, дзе служылі кліенты, і ўдакладнялі месцазнаходжанне часці. У жніўні 1942 г. нямецкі палкоўнік авіяцыі замовіў партрэт і пажадаў назіраць за працэсам яго стварэння, тым самым забяспечыў мастака Барадуліна пропускам для ўваходу на аэрадром. Такім жа чынам падпольшчыкі пранікалі і на чыгунку. В. Раманаў збіраў звесткі аб сістэме зенітнай абароны горада, ён жа апрацоўваў

і зашыфроўваў сабраную членамі групы інфармацыю. Падпольшчыкі выраблялі неабходныя пячаткі і штампы.

Летам 1942 г. група ўстанавіла сувязь з нямецкімі антыфашыстамі з аховы лагера ваеннапалонных, якія паведамлялі патрыётам пра аблавы і праверкі дакументаў у горадзе, дапамагалі арганізаваць некалькі ўцёкаў з лагера, перадавалі Шарэнду гранаты і патроны. Выратаваннем ваеннапалонных з лагера займаўся Быкоўскі. Аляксеенка здабывала медыкаменты.

Восенню 1943 г. з набліжэннем фронту майстэрню давялося зачыніць. Мастакі працавалі ў паўваеннай транспартнай арганізацыі «Штрала» (малявалі нумары на машынах, дарожныя ўказальнікі і г. д.), дзе мелі магчымасцьназіраць за рухам вайсковага транспарту, характарам перавозак.

У кастрычніку 1943 г. па распараджэнні партызан група Шарэнды выйшла з горада. 9 членаў гэтай групы сталі байцамі Лёзненскай партызанскай брыгады. Я. П. Барадулін загінуў на фронце ў 1944 г.

Кіраўнік групы Б. С. Шарэнда ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, Я. П. Барадулін – ордэнам Чырвонай Зоркі, В. Раманаў і Г. Аляксеенка – медалямі.Дзейнічала з сакавіка 1942 г. да лістапада 1943 г. Кіраўнік І. А. Бекішаў («Андрэй») – былы начальнік Кастрычніцкага райжылкіраўніцтва ў Віцебску – у 1941 г. трапіў у акружэнне, зімой 1941–1942 гг. звязаўся з падпольшчыкам М. А. Шпакавым, вясной 1942 г. – з армейскай разведгрупай Ю. С. Рудакова («Жоржа», «Ягора»). Выконваючы іх заданні, прыцягваў да разведвальнай работы новых людзей. Летам 1942 г. Іван Андрэевіч наладзіў сувязь з В. Р. Кудзінавым – адказным арганізатарам Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б па г. Віцебску.

З красавіка 1943 г. група працавала пад кіраўніцтвам Віцебскага падпольнага гаркама КП(б)Б. У яе складзе было 13 чалавек: камуністы І. А. Бекішаў і Р. П. Канаплёў, камсамолкі В. І. Турок (Старавойтава) і А. Ільюшчанка, 9 беспартыйных патрыётаў.

На працягу амаль 2 гадоў група забяспечвала дакладнымі звесткамі пра аэрадром. Бекішаў працаваў там электраманцёрам, таму склаў падрабязны план аэрадрома, разам з братамі Васілём і Генадзем Арлоўскімі замініраваў 2 самалёты, з Р. П. Канаплёвым выявіў несапраўдны аэрадром, што дало магчымасць савецкай авіяцыі бамбіць рэальны.

Жонка Бекішава, вядомы ў горадзе ўрач Г. І. Багданава, прымала пацыентаў дома, тым самым забяспечвала сувязь паміж членамі групы, перасылала партызанам медыкаменты, ратавала моладзь ад угону ў Германію. Разам з медсястрой В. І. Турок кругласутачна назіралі за шашой Віцебск – Сураж. Падпольшчык М. А. Панкоў («Косця»), які быў умелым гравёрам, вырабляў розныя пячаткі і штампы. Група забяспечвала сябе і

іншых патрыётаў узрыўчаткай і толам, працавала амаль без правалаў у цесным кантакце з існуючымі падпольнымі групамі. Адрас сястры Бекішава Ганны меўся ў Харужай, але Вера Захараўна яе не знайшла.

У лістападзе 1943 г. фашысты напалі на след кіраўніка групы, але яму ўдалося разам з сям'ёй апынуцца ў партызанскім атрадзе.

Іван Бекішаў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, Чырвонай Зоркі, 10 медалямі. Чатыры члены яго групы таксама маюць узнагароды.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Б. С. Шарэнды / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 498–499.

2. **Подпольная** группа Шарендо Б. С. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. — Минск, 1988. – С. 297.